***Матэрыялы рубрыкі рыхтуюцца супрацоўнікамі сектара сацыяльна-педагагічнага праектавання Нацыянальнага інстытута адукацыі Рэспублікі Беларусь.***

# Паміж дабром і злом

Асаблівасцю перажываемай намі сітуацыі з'яўляецца яе незвычайны дынамізм. Многае з таго, што яшчэ ўчора было адназначна добра, сёння гэтак жа адназначна дрэнна. У адукацыі крытычнаму аналізу падвяргаюцца мэты і каштоўнасці, змест навучання і выхавання, формы і метады педагагічнага рамяства. Старое пастаўлена пад сумненне, новае яшчэ не нарадзілася. Аказаўшыся без прывычных апор, душа імкнецца вярнуць назад ранейшыя асновы, былую "знешнюю" вызначанасць: ідэалогію, дакладныя палітычныя ўстаноўкі, рэлігійныя пастулаты. Аднак кожны раз яна выяўляе абмежаванасць, а часам і ілюзорнасць надзей такога роду. Відаць, нам давядзецца змірыцца з гэтымі новымі ўмовамі жыццядзейнасці, адмовіцца ад арыентацыі на адзіныя універсальныя асновы чалавечага ўзаемадзеяння і ўзяць нарэшце адказнасць на сябе, у тым ліку і за асновы ўласнага выбару.

Гэта значыць, што мы пастаўлены перад неабходнасцю спасціжэння складанай навукі самавызначэння, прычым гэтае ўменне належыць асвоіць не толькі нам самім, але і перадаць сваім дзецям, унукам.

З асаблівай сілай і вастрынёй праблема самавызначэння выяўляе сябе ў сферы маральнага выхавання. І гэта не дзіўна. Як нам усім сёння захаваць свой агульны дом — Рэспубліку Беларусь і пры гэтым дазволіць кожнаму развіваць сваю індывідуальнасць, меру і мерку Дабра і Зла? Прымяняльна да тэмы нашай размовы мы павінны не толькі перадаць дзіцяці свае маральныя крытэрыі, але і навучыць яго арыентавацца ў грамадскіх сітуацыях, будаваць і перабудоўваць нормы чалавечага ўзаемадзеяння. Як ніколі раней, становіцца значымым уменне разумець іншага, уступаць з ім у прадуктыўны дыялог, адмаўляцца ад пастаўленых мэт, калі парушаецца правіла "толькі за свой кошт".

У новай сацыякультурнай сітуацыі асаблівае месца пачынае займаць адукацыя. Яна становіцца эксперыментальнай пляцоўкай грамадства, той сферай, дзе задумваюцца, распрацоўваюцца і апрабуюцца адэкватныя часу формы чалавечага супольнага жыцця.

Артыкул псіхолага М. Л. Далінскага — пралог да вялікай і важнай размовы аб маральным выхаванні малодшых школьнікаў. Друкуючы яго, мы разлічваем на ўдзел у гэтай размове вучоных, практыкаў, бацькоў — словам, усіх тых, каму гэтая тэма не ўяўляецца банальнай.

**А. А. ПАЛОННІКАЎ, кандыдат псіхалагічных навук.**

*У детства свои, ему свойственные, способы видеть, думать и чувствовать...*
***Ж.-Ж. Руссо***

Кожны чалавек амаль штодзённа сутыкаецца з ацэнкамі "добра" і "дрэнна": чуе ад іншых, вымаўляе сам, чытае альбо піша. Гэтыя словы з'яўляюцца моцнымі атрыбутамі, пры дапамозе якіх людзі падзяляюць навакольную рэчаіснасць на два полюсы — станоўчы і адмоўны. Найбольш яскрава палярнасць ацэньваемых з'яў бачна ў той частцы нашага жыцця, якую рэгулююць нормы маралі.

Ад нараджэння да смерці мы вымушаны падпарадкоўвацца шэрагу маральных забарон і прадпісанняў. У першых падкрэсліваецца, чаго рабіць нельга: забіваць, красці, хлусіць. Другія скіроўваюць свядомасць у бок таго, што чалавек павінен рабіць: паважаць бацькоў, дапамагаць іншаму, спачуваць і г. д. Упершыню сістэма забарон і прадпісанняў узнікла ў выглядзе 10 запаветаў, якія атрымалі яўрэі каля 1250 года да н. э. Потым, праз тысячагоддзе, яны былі пісьмова зафіксаваны ў Бібліі на грэчаскай мове (прыкладна ў 240 годзе да н. э.).

У XX стагоддзі вучоных-псіхолагаў зацікавіла праблема адлюстравання маралі ў чалавечай свядомасці. Дзеянні, якія забараняюцца ў міжасобасных зносінах, атрымалі назву асацыяльных учынкаў, а тыя, што прадпісваюцца, пазначаны навуковым тэрмінам "прасацыяльныя паводзіны". Існуюць таксама і іншыя назвы ў розных галінах вывучэння чалавечай сутнасці.

Навуковая псіхалогія пачала вывучаць, якім чынам дзеці асэнсоўваюць і засвойваюць нормы культуры дарослых, што адчуваюць пры парушэнні забарон, калі ў іх пачынаецца і як ві-